гах, запанавала ахвота да вайны. У гэтым самым часе з Лондону, куды зьехаліся прэдстаўнікі ваюючых гасударствоў рабіць згоду, ідуць весткі, с каторых вельмі мала надзеі на згоду. Прэдстаўнікі абедзьвіх ваюючых старон ні ў чым ня хочуць уступаць. З гэтаго відаць, што калі ехалі прэдстаўнікі Турціі у Лондон рабіць згоду, то яны мелі іншае на мэці, бо як відаць з некаторых чутак, яны увайшлі у апошніе часы у патайную згоду з двумя суседнімі державамі, што: калі пачнецца вайна, то тые дзержавы дадуць помач Турціі. На сколькі гэтые звесткі праўдзівы нет ведама, але відаць нейкі грунт пад сабой маюць, бо у Турціі раптам знайшліся вялікіе грошы каторые нет ведама, адкуль узяліся. У тое, што бытцым скінуты Султан ахвяраваў Турціі, на вайну з балканскімі славянамі 40 мільёноў рублёў, палітыкі не надта хочуць верыць.

Ваеннае настраеньне проці Расеі у Кітаі не сціхае. Сабраньне кітайскіх купцоў з гор. Ханькоў, Учапа і Гонконга пастанавіло байкатаваць расейскіх купцоў. З расейска—азіяцкаго банку у Чыфу, за адзін дзень забралі паложэных там перш грошы 400 тысяч рублёў. Англійскіе газэты пішуць, што кітайскае правіцельство сабрало на граніцы Манголіі 30 тысяч войска.

## Аб вясковай хуліганшчыне.

У гэтым нумэры чытачы прачытаюць у карэспанденціяхъ з Першай с Полацкаго і Дзісенскаго поветоў, аб дзікіх паступках вясковай маладзежы, аб пьянстве, аб ігрэ у карты. Аднаго нажом пакалолі, другому разбурылі лазьню, некаго пабілі ні за што ні пра што. У кожнай вёсцы 2—3 хаты гандлююць гарэлкай. Дзеля гэтай лёгкасьці дастаць у усякую мінуту дня і ночы гарэлку, людзі часта співаюцца, а пьяны дакажэ тое, што цьвярозаму і у галаву ня прыдзець. Старые людзі жалюцца, што даўней такога пьянства і распусты ніколі не бачылі і няведалі. Са ўсіх кутоў Расеі і нашаго краю пішуць тое самае. „Правые“ дэпутаты выдумалі на хуліганства новае лекарства—розгі.

Дэпутаты Маклакоў і Шынгароў тым часам доводзілі у Думе, што хуліганства завялося ня толькі на нізу... Адзін сівы, як голуб, дзядзька з Вітэбшчыны, казаў нам, што хуліганства зменшыцца толькі тагды калі пяройдуць на хутары... Нам здаецца, што прычыны распусты маладзежы гэта не сама маладзеж, а усё жыцьцё вёскі, краю гасударства.

Маладзеж ужо ня тое, што іх забітые працай, заціснутые жыцьцём бацькі і дзяды, у каторых была адна думка; пакорнасць сваей безпраўнай долі і абы як небудзь прахарчавацца да вясны. Ешчэ дзяды і бабкі нашы памятаюць, як лебяду збіралі і мешалі у хлеб, і жылі часта на граніцы з голадам.

У пячурцы трымалі пад попелам вугалі, калі трэба было агня, то раздувалі; адна бабуля мне казала, што яе пасылалі да суседзёў „на агонь“, у анучцы якой бывала, нясець агонь у сваю хату. Стары дзед с пад Сол, казаў нам у вагоне, што даўней колы былі някутые, у усім возе не было кавалка жалеза, збруі ніякай не было, толькі хамут. У Вільню ехалі такім возам не адзін дзень, як цяпер, а 3—4 дні. Цяпер ужо унукі ня ўмеюць збірацъ лебяды. Народ па вёсках пабагацеў (на агул), ядуць лепш, заработкоў больш, гаспадарка з натуральнай зрабілася гандлёвай, усё ідзець на продаж.

Усё змянілося, людзі змяніліся, але варункі жыцьця мала змяніліся.

Мужык не маець суда, бо валасны суд, гэта ня суд. Суда і праўды на вёсках німа; дзеля гэтаго німа чаго шукаць, пашаны да людзкіх і грамадзкіх правоў. Аб бязсудзьдзі па вёсках говораць ужо 7 гадоў у Думе, але: „воз і цяпер там“.

Рэлігія, школы! Адзін сьвяшчэннік казаў, што ён казаньня кажэць у цэркві, каб не кралі, ня біліся і т. д.

—„Але я ведаю, што усё роўна будуць красьці, а толькі крадучы ён будзе ведаць, што робіць грэх“.

Рэлігія, калі яна цесна звязана з жыцьцём, з бытам народу, з яго мовай, тагды яна яму ня будзе здавацца нечым-то парадным, але блізкім да душы і жыцьця.

Школы, у „Нашай Ніве“ мы некалі разбіралі, як народ глядзіць на школу.

Два вучыцелі нам доводзілі, што школа часамі бываець і шкоднай, бо яна так сама атарвана ад жыцьця, яна адбіраець усе старадаўные бацькоўскіе правілы, погляды на сьвет, а новых не ўсягды патрапіць крэпка усадзіць. А народ хочэ, каб школа ня толькі вучыла чытаць і лічыць, але, каб рабіла хлапца сумленным, акуратным і слухмяным.

Цяпер вяскова маладзеж ня ведаець куды дзець свой вольни час, німа на вёсцы ні кніг, ні хаўрусоў, ні газэт, ні народных тэатроў, німа ніякіх агульных грамадзкіх інтэрэсоў, которые падымаюць дух і робяць чэлавека вышэйшым.

*А. У.*

## Прарок.

Сярод мавы, сярод пасьмешкаў,
Знак нейкі цісну чы к грудзям,
Ішоў прарок пешчанай сьцежкай
З навукай новаю к людзям.
Праціўвы вецер лез у вочы
І плачэм пеў, як дзіцянё,
Зьвярьё зубамі йграло ў ночы,
Днём выло ў небе груганьнё.
А ён, не знаючы граніцаў,
Ішоў хістаючысь на—ўслонь;
Агонь біў толькі із зраніцаў,
Вялікіх праўд сьвяты агонь.
Душа пылала дзіўным жарам,
Бы з зораў выснутая ніць,
Што сьвет магла-б сваім пажарам
Абвіць і к сонцу ў васкрасіць.
Ужо з сваім аклічным словам
Прарок далёка быў вядом,
Народу шмат збудзіў к дням новым,
Даў славу братнюю братом.
Аж так дасціг—аквечан хвалай
Зямлі забранай сумных хат,
Дзе царство цемры панавало,
Дзе сілу ўзяў над катам кат.
Народ змарнеўшы таго края
Свайго на’т імені не знаў,
Як непатрэбшчына якая,
Гібеў на сьвеці і канаў,
Галовы людзі пахіліўшы
Зямлю капалі, як краты,
Утапіушы ў мёртвай ночнай цішы
Усе жадання яснаты.
Прарок—пасол сьветла—ў загону
Людзей убачыўшы такіх,
Маячыць стаў ім, як шалёны,
Прарочым голасам сваім.
. . . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . .
Глядзіце: прадзедавы косьці
У зямлю калісь за вас ляглі,
А вы, як збэшчэные госьці,
Пракляцьцем сталі тэй зямлі.
Дзе вашы песьні жыватворны?
Дзе ў вас пракрокі й дудары,
Што над пагібельнасьцяй чорнай
Віталі-б полымем зары?
Забылі ўсё, згубілі долю,
Зьмешалі славы цьвет з гразёй,
І запрадаліся ў няволю,
З душой і скурай счэзлі ў ёй.
Пара у рукі браць паходні,
Уставаць, ісьці, ноч разсьветляць!
Бо што ня возьміце сягодня,
Таго і заўтра вам не ўзяць.
На зло крывавым перашкодам
Скідайце ёрмы, клічцэ сход,
І дайце знаць другім народам,
Які вы сільны йшчэ народ!..
За мной, за мной, забраны людзе!
Я добрай доляй послан к вам;
І знаю, што было, што будзе,
І вас у крыўды не аддам.
Так гаварыў і з рабства клікаў
Людзей на волю той прарок,
Ждучы с трывогаю вялікай
Ад іх атказу не ў нарок.
А людзі глянуўшы на сонцэ
Атказ казалі грамадой:
— Па сколькі-ж нам дасі чырвонцаў,
Калі мы пойдзем за табой?
. . . . . . . . . . . . . . . .

**Янка Купала.**

Спб. 7/XII 1912 г.

## МАЛІТВА.

Я бачыў: сын Яго стаяў
На пушчы і маліўся.
І словы ў гневі прамаўляў,
А твар слязмі абліўся,
— »Ах, дай мне, Ойчэ, моцных слоў!»
Маланак слоў палючых
Бо кроў мая сачыцца зноў
Із раноў тых блючых...
Дзівіся, Пане: слабы Я,
Саўсім німаю сілы,
Гарыць, баліць душа мая
— О, дай-жэ моцы Мілы!
Паглянь: паўсюдых с краю ў край
Рабунак, глуз панують.
І льецца сьмех тых чорных зграй,
І ўсё с зямлёй раўнують.
Зірні: дзе пекнасць тая, што
Надаў нам, Міласьцівы?
Тваіх правоў трымае хто,
Братэрства, згоды хцівы?
Схініся к нам Ты і абач:
— З гадзінай горш жывецца;
Цяжэе боль, мацнее плач,
Галоў ўсё болей гнецца.
Паслухай ноччу, ў дзень, Сьвяты,
Скажы маўчаці звонам,
І колькі жальб пачуеш Ты!
— Земля азвецца стогнам...
Узглянь: навокал чорны сьвет,
Прыцьмёна праўды сонцэ,
Надзеі ў людзях болей нет,
Пашлі-ж ім Абаровца.
Дык дай мне, Божэ, моцных слоў!
— Земля;б ад іх трасласяі
Баляць бо раны Мае йзноў
І кроў з іх палілася...
Пашлю тады маланкі ў люд,
У безсчасны той, брадзіці,
Блішчэць, яскравец там і тут
І праўду сонную будзіці.
Мільёны кіну пяруноў
У тых, каго я знаю,
У тых, што сочуць маю кроў
У тую чорну зграю.
Тагды ізноў, як колькі раз
На сьвеці ўжо бывала,

— Бо белы ужо даўно здох і ён цяпер на гнядым ездзіць.—Атказывае кнігар.

*Мінск.* **Галубок.**

## Пра звон, ды гарматы.

(*Гутарка дзеда*).

У мястэчка N прівязьлі дось вялікі звон. Падзівавацца сабраліся: тутэйшы паліцэйскі вураднік, валасны старшыня, пісар і некалькі чалавек багацейшых жыхароў. Адзін жыхар па імені Юзук, шчупаючы сваімі куксатымі пальцамі прівезены звон прікмеціў:

— О, то звон, дык звон, бадай у сьвеці німа большага.

Быўшы там пад той час стары дзядзька — мікалаеўскі ваяка, вялікі аматар да лганьня, сваім хрыплым голасам загаманіў:

— Э, то ня звон!

— А што-ж гэта, скажы дзядзька, калі ня звон,—запытаўся Юзук.

— Э, што за звон гэта!

— Ну, дык, не каза-ж гэта,—нясьмела стаў спрэчацца Юзук.

— А я табе кажу—гаманіў ваяка,—што гэта, брат, па моему ня будзе звон, ды ешчэ вельмі вялікі, як вы кажэце, а гэта якраз будзе маленькі званочэк.

Усе зарагаталі...

— Ты у Маскве бываў — пытае ваяка у Юзука.

— Не.

— Цара звана не бачыў?..

— Не.

— Калі не, то і маўчы з сваім звонам. Вот я брат—кажэ ваяка—бываў у Маскве і цара-звона бачыў, вот там звон, дык звон: пад сабою умешчае 10 гарадоў, 5 вялікіх мястэчэк; 40 сёлаў. Вагі толька мае 603 пуды 1000 фунтоў, а серцэ яго важыць мільён пудоў 808 фунтоў. На загавіны, ведама, як там вядзецца: то пад агурочак, то пад капустачку — усе па чарцы, ды па чарцы і як добра наглытаюцца адразу на званіцу узлазяць сто чэлавек, становяцца 50 чэлавек з аднаго боку, а 50 чэлавек з другога і пабраўшыся за вяроўкі ківаюць, ды ківаюць серцэ звана і, якраз, на першы дзень Вялікадня, роўна а поўдні калі вытнуць у звон, а братткі вы мае!.. то ён гудзіць аж да Тройцы самой.

У гэту гутарку умешаўся старшыня і кажэ:

— І... досыць вам ужо баўтаць аб званы, вот вы лепш паслухайце, што я вам раскажу. Ешчэ як я служыў у Коўні, у маскалёх, дык у наш полк прышла папера, што прыеждж ае самы старшы генерал—смотр рабіць. Зараз салдат павыстаўлялі, панаводзілі гарматы, а генерала німа, ды німа. А нашы старшые гайсаюць, аж пот з іх цурком бяжыць—гэта адзін з іх, людцы вы мае, зірк у гармату — заржавелая, зірк у другую—заржавелая, у трэцьцю—заржавелая.

Як бачыш, паслалі салдата у горад да сальніка-купілі дзесяць хунтоў сала, і пазакасыўшы рукавы, гарматы вышмаравалі, вышмаравалі; і усё як мае быць гатова. А бегла каля гарматы, каб яна здохла, маленькая, чорнашчокая сучачка: нюх — сала пахнець, яна другі раз нюх—сала, ой сала! Яна доўга нечэкаючы, хвосьцікам віль, віль, улезла у гармату сядзіць сабе, ды ліжэ, сала, ліжэ дый ліжэ! Аж прыеждж ае генерал. Закамандаваў стрэляць з гармат. Як джарахнулі, а сучачка чорнашчокая ляціць у высі ды брэшэ, ляціць ды брэшэ, ляціць ды брэшэ.

. . . . . . . . . . . . . . . .

Так сама брэшэ, як мікалаеўскі ваяка пра маскоўскі звон, а старшыня пара гарматы.

*Івенец.* **Пятрукоў. М.**

## Снатворны мак. *)

(*Сцэна для дзіцячых тэатроў*).

*Сцэна II.*

Абстава тая, што й была.

(Званочэк адзін, сядзіць на ўслоне і стружэ сабе цыганчыкам кіёчка)

**Званочэк.** Мак пашоў у госьці да Рожы. Як добра па брацку яны жывуць між сабою; нічога ня робяць адно другому на перакор, не зайздросьцяць, расінку і тую падзеляць паміж сабою па роўну. Люблю я гэткае брацкае жыцьцё... (*Глядзіць на неба*). Як ясна сягоньня сьвеціць сонейка. Кветачкі так і цягнуцца да яго, як дзеткі да свае мацеры. І як яно багата ды пышна адзело усіх! Наш Мак што ні дзень, то ўсё харашэе. А Рожу трудна ўзнаць,—гэткая стала чырвона ды пышна!.. Куды ня ўскінеш вокам,—усюды усё расьце, паўнее, красуецца. Хвала Сонейку за яго вяліку міласць і шчодрасць!..

Я настружу кіёчкоў, ды падапру імі слабейшые кветачкі, каб яны ад ветру не хіліліся на зямлю. (*Званочэк задумывацца, а потым пачынае сьпеваць сумную песьню. Нехта стукае у дзьверы. Званочэк атчыняе. Уходзіць ДзедЛесавік*).

Званочэк, Дзед-Лесавік.

**Дзед.** Божэ, памажы, хлопчэ!

**Званочэк.** Дзедка, мілюсенькі, гэта ты? Як-

*) Гл. № 49—50.

